ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org
№ 7 (235) 22–28 лютага 2002 г.

СТОЙ, КТО ИДЕТ?

ВОЕННАЯ РЕФОРМА - 1



АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Лет 10–15 тому назад если случалось встретить на улице человека в форменной одежде, то, почти всегда, это был военный. Теперь же, куда ни плюнь, обязательно попадешь в милицейского униформиста. Военные мундиры сейчас ой как редки. А скоро их будет еще меньше. Поскольку грядет «*заключительный этап реформирования вооруженных сил*» государства белорусского.

Из всех государственных институтов больше всего белорусское общество отделилось от армии. Народ и армия сегодня отнюдь не так едины, как в советские времена. В основном, только 23 февраля в штатской среде ныне принято вспоминать об армии и человеке с ружьем.

Вооруженные силы достались независимой Беларуси от старого советского мира. Части, соединения и объединения Краснознаменного белорусского военного округа в 1991 году были механически переподчинены новой власти вместе со всем личным составом и боевой техникой.

Исключение составили тактические ядерные боеприпасы, от греха подальше репатриированные новыми русскими генералами, столь же механически, как и их бывшие белорусские сослуживцы, ставшие воинством суверенной России.

О том, чтобы в руки самозваных белорусских правителей не попали оперативно-тактические ракеты, позаботилось мировое сообщество. Опять же под международным контролем было обеспечено уничтожение бронетанковой техники, подлежавшей сокращению в соответствии с договором об ограничении стратегических наступательных вооружений, заключенном еще во времена СССР.

И слава Богу! Ведь буквально через несколько лет президент Лукашенко публично сожалел, что его оставили без ядерной дубинки и безвременно утилизировали кучу бронетехники.

В начале 90-х отнюдь не напрасно опасались на Востоке и на Западе белорусских суверенщиков. Верховный совдеп под началом Станислава Шушкевича принял несколько на редкость безграмотных в военно-политическом смысле законодательных актов.

Из закона «Об обороне» явствует, что на тогдашний Совмин под председательством Вячеслав Кебича возлагались функции своего рода коллективного верховного главнокомандующего. На практике данный военно-политический курьез обернулся тем, что высокие воинские звания присваивал мелкий чиновник из аппарата Совмина. Его фамилию теперь помнят только те, кто с его благоволения обрел генеральские чины или должности командиров дивизий.

Военная реформа эпохи Кебича-Шукевича также ознаменовалось проектом концепции нейтралитета, разработанного Уралом Латыповым. Да обозначилась военными эмблемами с гербом «Погоня», рисованием бело-красного белого флага на дверцах армейских автомобилей и переименованием двух общевойсковых армий (объединений) КБВО в корпуса белорусских сухопутных сил. Не обошлось и без сокращений личного состава.

До сих пор вооруженные силы не являлись инструментом большой политики власти, предержащей Беларусь. В конце концов политика взяла свое, и президентская власть ввязалась в кампанию по военной реформе.

На седьмой год своего президентства Александр Лукашенко и его администрация концептуально задумались над военными проблемами. До обновления военного законодательства Кебича-Шушкевича еще дело не дошло. Зато в 2001 году появилась принципиально новая концепция национальной безопасности, разработанная все тем же Уралом Латыповым. Была отредактирована и военная доктрина. А в войсках началась кампания под кодовым наименованием «*Заключительный этап реформирования вооруженных сил*».

Прежде всего учинили Генеральный штаб, к которому перешли все чисто командные функции, ранее возлагаемые на Совмин и его военный отдел, называвшейся министерством обороны. Отныне в Беларуси выстраивается четкая структура военной иерархии. Так как непосредственно Генштабу подчиняются два вида вооруженных сил: сухопутные войска и ВВС вкупе с ПВО.

Продолжение на стр. 3 ➲

ПАЛІТАСВЕТА

Узяць усё й падзяліць

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

БНФ «Адраджэньне» адчувае пільную неабходнасьць вызначыцца адносна свайго стаўленьня да рынкавых рэформ у Беларусі. Пакуль бальшыня партыйцаў не зразумела каштоўнасьці свабоднага рынку, таму адмыслова для старое гвардыі зладзілі канфэрэнцыю па праблемах эканамічнага разьвіцьця.

Акрамя экспэртаў у эканоміцы, актыў партыі запрасіў на сэмінар вядомых у мінулым дзяржаўных дзеячаў, блізкіх да грошай, а таксама сасьпелых на апазыцыйнай ніве эканамістаў-самавукаў. Экспэртам належала дапамагчы разабрацца БНФаўцам з тым, якой павінна быць іх эканамічная праграма хаця б для таго, каб пазыцыянавацца ад лукашэнкаўскіх захадаў. Аднак падабенства перадвыбарчых праграм альтэрнатыўных кандыдатаў на прэзыдэнцтва ў 2001 годзе не падалося некаторым з прамоўцаў ненармальным.

Менавіта бацькава эканамічная палітыка выклікала сымпатыі шмат у каго з прысутных. У прыватнасьці Леанід Заіка заявіў аб сваёй «*бясконцай удзячнасьці спадару Лукашэнку*» за захаваньне калгасаў. Гэтая форма ўласнасьці больш зьядае, чым дае харчаваньня, таму беларускія крамы запоўніліся расейскімі прадуктамі, больш чыстымі, на думку Заікі, чым сабраныя з радыяктыўных палёў беларускія.

Жарты жартамі, але заклікі зьвярнуць увагу на ідэі Карла Маркса й крыўда ад таго, што да марксызму цяпер ставяцца скептычна, гучалі з вуснаў іншага прамоўцы. Сьцяпан Васкоўскі галоўную супярэчнасьць бачыць у спалучэньні машыннае працы й дзяржуласнасьці. Невядома, у якіх падручніках ён прачытаў, што такі кактэйль вядзе толькі да крызысу, але прапаноўваючы перадаць усю зямлю ў калектыўную ўласнасьць, ён спасылаўся на К. Маркса. «*Ад таго, як абыдуцца цяпер з уласнасьцю, залежыць цяпер лёс беларускага народу як этнасу*», — падкрэсьліваў ён, згадваючы нацыяналізм прысутных.

Галоўнае, на думку Васкоўскага, скінуць чыноўніка з шыі селяніна. Аб прыватызацыі, на яго погляд, думаць пакуль рана. Аднак менавіта акцыянаваньне прадпрыемстваў выклікала шмат пены ля вуснаў. Асабліва хвалявалі партыйцаў спробы расійскага капіталу пранікнуць у Беларусь. Важным, па меркаваньні бальшыні прысутных, сталася працідзеяньне прыватызацыі зьверху. Не апошнюю ролю ў гэтым павінны адыграць СМІ. Менавіта друк, радыё і інтэрнэт павінны патлумачыць народу, што «*посьпех эўрапейскае прыватызацыі быў абумоўлены тым, што яна была ініцыяваная зьнізу*».

Меркаваньні разьдзяліліся. Нехта заявіў, што пужацца прыватызацыі зьверху й прыватызацыі наагул нявара, бо ў Беларусі няма тэхнічных умоў для яе ажыцьцяўленьня. Ліквідаванае адпаведнае міністэрства, адсутнічаюць інвэстыцыйныя фонды й умовы, прывабныя для сур'ёзных бізнэсоўцаў. Аднак, на думку аднаго з партыйцаў, чакаць замежнікаў неабавязкова. Ён згадаў прынцып Шарыкава — «*узяць усё і падзяліць*» паміж сваімі. Але перш чым раздаць народу багацьце (па ягоных падліках, па 50 тысяч *USD* на брата), варта пачакаь год 18, каб народ прызвычаіўся да салодкае думкі.

Асобна ад радыкалаў з БНФ трымаліся лібэралы Я. Раманчук і П. Данэйка. Яны горача падтрымлівалі прыход расейскіх тоўстых кашалькоў на беларускі рынак і небеспадстаўна сцьвярджалі, што без замежнага капіталу беларускай эканоміцы не ачомацца. У А. Патупы, як заўжды, сваё арыгінальнае меркаваньне, не пазбаўленае рацыянальнага зерня: зь ягоных словаў вынікае, што Расея ўжо паставіла заходнюю сястрычку на лічыльнік. Тэрмін разьлікаў — тры месяцы (да красавіка). Ёсьць некалькі варыянтаў саскочыць: увайсьці ў якасьці суб'екта фэдэрацыі ў Расею, эканамічна інтэгравацца (атрымліваць танны газ, але не перашкаджаць расейскім бізнэсоўцам дзейнічаць па расейскіх законах), ці прадаць-такі расіянам прадпрыемствы.

Грамада была ўпэўненая, што для поўнага шчасьця й уздыму нацыянальнае эканомікі не хапае 400-500 мільёнаў *USD*. Насамрэч лічба гэта ў некалькі дзесяткаў разоў большая. Расея, зь якой нітуецца столькі надзеяў, ужо пазычала Беларусі гэтую суму (двухсотмільённы крэдыт і нявыплачаныя за спажыты газ грошы). Аднак гэтай сумы хапіла пакуль толькі на падтрымку курсу беларускага рубля да адвечна каштоўнага амэрыканскага даляра. ■

АНЕКДОТ-С

***

– Граждане пассажиры! Просьба не волноваться и пристегнуть привязные ремни. Светлячки, которые вы наблюдаете по правому борту, – это зенитный огонь. Вас приветствует экипаж пикирующего бомбардировщика...

***

– Скажи пароль.
– Пароль.
– Проходи.
– Куда! Стой! Стрелять буду!
– Стою.
– Стреляю.

НАВІНЫ

$100. Больш за палову працоўных грамадзян Беларусі мелі ў снежні 2001 года даход, меншы за 90 тысяч рублёў, ці $57. Гэткія вынікі даследавання, праведзенага сацыялагічнай службай ЦК Партыі камуністаў Беларускай. Даходы яшчэ 35% апытаных ад $57 да $95. Даследаванне паказала, што абяцаньня А. Лукашэнкам $100 на кожнага працоўнага сем'яніна здабылі, у лепшым выпадку, толькі 8% беларусаў.

Страйк. Агульнарэспубліканская акцыя пратэсту, ініцыяваная ФПБ, магчыма, адбудзецца 21 сакавіка, не выключаючы ў Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай. Канчатковае рашэнне пра формы і час яе арганізавання будзе прынята 21 лютага на паседжанні Прэзідыуму савета ФПБ, пасля якога і запланаваная падача заяўкі ўладам. Цяпер у працоўных калектывах адбываецца абмеркаванне прапановы кіраўніцтва ФПБ пра наладжанне акцыі пратэсту ў Мінску, а таксама ў абласных і буйных раённых цэнтрах краіны.

Наваполацк. 27 лютага ў Наваполацку прыватныя гандляры, з падтрымкаю мясцовай арганізацыі АГП, маюць намер правесці мітынг. Прычынай своеасаблівага пратэсту ёсць намер гарадскіх уладаў павысіць у 3–10 разоў стаўкі арэнднай платы на кірмашах. Некаторыя з гандляроў змушаныя будуць штодзень плаціць арэндную плату каля 30 тысяч рублёў. Зацвярджанне новых ставак улады гораду пакуль перанеслі на пазнейшы час.

Зброя. Амерыканскія кангрэсмены 16 лютага наведалі Мінск, каб высвятліць пытанне нелегальных паставак зброі дзяржавам, якія падтрымліваюць тэрарызм. Дэлегацыя складалася з трох чалавек, іх візіт доўжыўся 5 гадзінаў. Кангрэсмены мелі перамовы з міністрам замежных справаў Беларусі Міхаілам Хвастовым, міністрам абароны Леанідам Мальцавым і дзяржсакратаром Савета бяспекі сп. Няўрыласам, падчас якіх выказалі сур'ёзную заклапочанасць паведамленнямі пра гандаль зброяй і пра стасункі з краінамі, якія падтрымліваюць тэрарызм. Афіцыйныя беларускія асобы заявілі, што гатовы ўдасканальваць у распрацоўцы механізму, які б дазволіў кантраляваць гандаль зброяй ва ўсім свеце.

Прафсаюзы. Новым прэзідэнтам Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў абраны Мікалай Канах. Абранне адбылося на праведзеным 16 лютага IV з'ездзе БКДП. Дагэтуль М. Канах быў віцэ-старшынёй арганізацыі. Папярэдні кіраўнік БКДП Віктар Бабаед падаў у адстаўку, патлумачыўшы гэты крок немагчымасцю сумяшчаць дзве пасады – ён таксама кіруе Незалежным прафсаюзам гарнякоў.

Даклад. Даклад аб правах чалавека ў Беларусі ў 2002 годзе быў рэпрэзентаваны 16 лютага на справаздачна-выбарчым сходзе Беларускага Хельсінкскага камітэта. У дакуменце падкрэслена, што ў Беларусі працягваецца парушэнне прынцыпу вяршэнства закону і Канстытуцыі, парушаецца роўнасць грамадзянаў перад законам, зафіксавана мноства выпадкаў бесчалавечнага абыходжання з людзьмі, не знойдзеныя вядомыя асобы, якія зніклі ў папярэднія гады. На праведзеным сходзе таксама адбылося абранне кіраўніцтва БХК: старшынёй зноў стала Тацціяна Процька, а намеснікам – Гары Паганяйла.

Грып. На карантын з прычыны грыпу ў Беларусі зачыніліся больш за 160 школаў. Эпідэмія грыпу абвешчана ў 12 раёнах краіны. Толькі за мінулы тыдзень па дапамогу ва ўстановы аховы здароўя са скаргамі на сімптомы грыпу звярнуліся больш за 83 тысячы чалавек. Сёлета, які і папярэднія 5 год, узбуджальнікам эпідэміі стаў вірус грыпу В.

Візы. Змены ў візавы рэжым з Беларуссю ўнёс урад Латвіі. Цяпер у выпадках, калі мэтаю наведвання нашай паўночнай суседкі будзе аздараўленчы і культурны турызм, візы можна будзе атрымаць на падставе курортных і турыстычных пуцёвак. Пры ўездзе ў Латвію трэба будзе мець не менш за 60 латаў ($100) на кожны дзень знаходжання ў краіне.

Суд. Адвакаты былых байцоў «Алмазу» Валерыя Ігнатовіча і Максіма Маліка, якім інкрымінуюць выкраданне аператара ОРТ Зміцера Завадскага, лічаць недаказанаю віну сваіх падабаронных. Прадстаўнік жа маці Завадскага Ігар Аксёнчык лічыць падсудных вінаватымі, але выказвае меркаванне, што Ігнатовіч і Малік былі толькі выканаўцамі забойства, галоўныя ж фігуранты пакуль пазбеглі адказнасці. Спробы звязаць справу аб знікненні Завадскага са знікненнямі вядомых беларускіх палітыкаў старшыня суда тут жа спыняў. Наступнае судовае паседжанне па гэтай справе адбудзецца 25 лютага.

Смаленск. Колішні беларускі горад Смаленск збіраецца зрабіць сталіцаю Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Павел Барадзін. У сувязі са сваімі планамі дзяржсакратар Саюза абяцае атрымаць інвестыцыі на будоўлю другой чаргі Смаленскай АЭС. Тым часам кіраўнік Цэнтравыбаркама Расіі Аляксандр Вешнякоў лічыць малаверагодным прыняцце сёлета Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы. Пра гэта ён заявіў у пятніцу ў Маскве. Вешнякоў адзначыў таксама, што *«пакуль няма пэўнасці, з чаго пачынаць стварэнне Саюзнай дзяржавы»*, з палітычнай надбудовы ці са збліжэння ў эканоміцы.

АБСЕ. Нацыянальны сход Беларусі не будзе прэзентаваны на зімовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Такое рашэнне прынята таму, што «беларускага пытання» няма ў парадку дня сесіі. Да таго ж, Нацыянальны сход пакуль не атрымаў афіцыйнага запрашэння. Аднак намеснік старшыні сталай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Беларусі па міжнародных справах і сувязях з СНД Анатоль Красуцкі лічыць, што прадстаўнікі Нацыянальнага сходу могуць прысутнічаць на згаданай сесіі і без запрашэння.

Цэнтр. Стварыць Цэнтр заканапраектнай дзейнасці пры Нацыянальным сходзе прапаноўвае дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Навасяд. Сваю прапанову ён матывавў тым, што цяпер амаль усе законапраекты, якія ідуць на разгляд у Нацыянальны сход, распрацоўвае Цэнтр заканапраектнай дзейнасці пры прэзідэнце. Летась парламентары распрацавалі ўсяго тры законапраекты.

ХІТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ

«Ни одна из белорусских партий не соответствует ни словарному определению, ни поэтическому образу»

(В. Быченя, «Народная газета», 20.02.02)

«Наша молодая биатлонная «поросль» женского пола приятно удивила»

(И. Римашевская, «Белорусская нива», 20.02.02)

«Не таким весомым, как предполагали, оказался хлебный каравай: тут сказались нехватка удобрений и природные катаклизмы»

(В. Кубеко, «Народная газета», 20.02.02)

МОЛАДЗЬ

Праграма-мінімум ёсьць

АНТОСЬ САКОВІЧ

У нядзелю, 17 лютага, адбыўся VI зьезд ГА «Маладая Грамада». Сацыял-дэмакратычная моладзь нарэшце вызначылася са сваёй праграмай і плянамі на кампанію па выбарах мясцовых саветаў, што адбудзецца праз год.

Спробы прыняць Праграму Маладой Грамады былі яшчэ ў 1999 годзе на мінулым V зьездзе. Але тады большасьць дэлегатаў засталася праектам незадаволенай – фактычна гэта былі толькі прынцыпы й дэкляраці. Гэтым разам Маладая Грамада па ўласнаму сьціпламу прызнаньню *«упершыню ў сваёй гісторыі й наваг гісторыі краіны»* адаптавала да беларускай глебы *«найбольш сучасныя падыходы й канцэпцыі сёньняшніх ідэолягаў левага руху»*.

Праграма МГ складаецца з дзьвюх частак. Першая ўтрымлівае й раскрывае асноўныя прынцыпы й каштоўнасьці сацыял-дэмакратыі як палітычнага руху й ідэалёгіі. Другая датычыцца непасрэдна канцэпцыі развіцьця Беларусі паводле гэтых прынцыпаў. Паколькі пры падрыхтоўцы дакумэнту ўлічваліся напрацоўкі ня толькі беларускіх, але й швэдзкіх, нямецкіх ды польскіх эсдэкаў, значнае месца ў праграме адводзіцца стаўленьню Маладой Грамады да найбольш вострых й актуальных выклікаў сучаснасьці, напрыклад, працэсу глябалізацыі.

Здавалася б, якім чынам глябалізацыя закранае Беларусь? Але, па словах старшыні арганізацыі Тацьцяны Алесінай, *«прыватызацыя расейскім капіталам беларускай вытворчасьці ёсьць адной зь яго праяваў»*. *«Мы прымаем глябалізацыю як аб'ектыўны працэс, але выступаем за яго празрыстасьць і больш дэмакратычны характар. Трэба ўлічваць ня толькі інтарэсы карпарацый, але й людзей»,* – заявіла лідар Маладой Грамады. Таксама эсдэкі выказаліся супраць так званага структурнага расызму – любых мэханізмаў дыскрымінацыі любой асобы па любой прыкмеце. Дарэчы, адзін з госьцяў зьезду, старшыня Беларускай лігі сэксуальных меншасьцяў «Лямбда» Эдвард Тарлецкі, сказаў, што МГ – першая беларуская арганізацыя, якая недвухсэнсоўна выказалася супраць прыцясненьня сэксуальных меншасьцяў у нашай краіне.

Таксама на VI зьездзе ГА «Маладая Грамада» былі прынятыя дзьве рэзалюцыі. Адна канстатавала неабходнасьць аб'яднаньня беларускіх партыяў левага кірунку й выказала падтрымку плянам па стварэньні аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі з БСДП А. Караля, БСДГ С. Шушкевіча й Партыі «Надзея» В. Палевіковай. Другая рэзалюцыя акрэсьліла пазыцыю Маладой Грамады па пытаньню будучых мясцовых выбараў. МГ зьбіраецца браць у іх актыўны ўдзел і вылучаць сваіх кандыдатаў. Урэшце, на зьезьдзе адбылося й перааб-раньне кіраўніцтва. Старшынёю ГА «Маладая Грамада» на другі тэрмін засталася Тацьцяна Алесіна. ■

ГРАМАДЗКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

Мэмарыял у Курапатах

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Грамадзкія ініцыятывы «За ўратаваньне мэмарыялу Курапаты» і «Моладзь у абарону Курапатаў» прадставілі свой праект канцэпцыі мэмарыялу нацыянальнага нэкропалю.

Па мерканьні Аляксея Марачкіна, аднаго з аўтараў праекту, менавіта з канцэптуальных, а не канкрэтных прапаноў варта пачынаць працу ў месцы смутку. Мастак згадаў, што ў 1989 годзе конкурс на лепшы плян мэмарыялу ў Курапатах ўжо праводзіўся. Выбар з 51 варыянту так і ня быў зроблены, бо праектвры недакладна ўяўлялі сабе задачу. Архітэктары намагаліся зрабіць нешта кшталту Берасьцейскае крэпасьці.

Цяпер ініцыятары абароны Курапатаў як гісторыка-культурнае каштоўнасьці 1-е катэгорыі маюць правесьці шырокае грамадзкае абмеркаваньне адносна таго, якім мусіць быць мэмарыял, і запрашаюць да супрацоўніцтва ўсіх жадаючых. Але перадусім, па іх меркаваньні, неабходна, каб дзяржава належным чынам ахоўвала статус урочышча, а ўлады спынілі ўсялякія земляныя працы на месцы пахаваньняў.

На сябе ініцыятары гатовыя ўзяць азначэньне тэрыторыі мэмарыялу. Яны згодныя абнесьці комплекс агароджай з камянёў, мэталу ці цаглін, узвесьці ўваходную браму, зьмясьціць каля яе картусхему тэрыторыі з вызначанымі археолягамі мясьцінамі пахаваньняў.

На спрытную руку 13 год таму ва ўрочышчы ўсталявалі Крыж пакуты. Па задумцы абедзьвюх грамадзкіх ініцыятываў, менавіта ён мусіць цяпер стаць дамінантай будучага мэмарыялу. Рэлігійная акалічнасьць займае значнае месца ў праекце канцэпцыі. Увесь некропаль плянуецца аздобіць крыжамі. А алея смутку (прасека), што вядзе да ўзгорку-Галгофы, павінна нагадваць аб расстраляных тут юдэях і, чамусьці, мусульманах.

У пэрспэктыве каля магілак ахвярам таталітарнага рэжыму плянуюць збудаваць храмы розных канфэсіяў і музэй, ствараўшы, такім чынам, міні-Ерусалім. Сымбалізм гэтага помніка яшчэ й у тым, што па ўсёй тэрыторыі Беларусі раскіданыя такія ж магілкі расстраляных ў часы лютаваньня сталінскага рэжыму. Мэмарыял у Курапатах павінен стацца напамінам аб тагачасных рэпрэсіях і перасьцярогай ад будучых. ■



SALT LAKE 2002

ПОМОЖЕМ СЕБЕ САМИ

СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

Нынешняя Олимпиада уже явила миру множество скандалов, и допинговые не числились среди самых громких.

В конце концов, все уже привыкли, что хоть кто-нибудь попадется, ведь без этого в последнее время не обходится ни одно крупное соревнование. Казалось, что придумать в этой области чтолибо новое уже невозможно, но оказалось, что в нашем мире возможно все. К сожалению, в эпицентре очередного скандала оказалась Беларусь.

То, что проба нашей конькобежки Юлии Павлович дала положительный результат, еще полбеды. Проблема в том, что на повторное обследование она не явилась. Представитель МОК Франсуа Каррар заявил, что будет проведено расследование, которое может грозить Беларуси серьезными санкциями. Например, обрезанием финансовой помощи нашему НОКу. В виде аванса обещанных санкций руководитель белорусской делегации в Солт-Лейк-Сити Ярослав Баричко временно отстранен от выполнения своих обязанностей и лишен аккредитации.

Эта ситуация порождает множество вопросов, и сложно решить, какие из них более важны. Отлучение от обязанностей руководителя на Олимпиаде – явление новое, беспрецедентное, поэтому решить, вправе ли руководство МОК пойти на такой шаг, сложно.

Гораздо любопытнее позиция белорусской стороны. Ведь ситуация, по большому счету, рядовая. Как уже упоминалось, пойманных на допинге спортсменов великое множество. Это, конечно, неприятно: спортсмен лишается возможности участвовать в международных соревнованиях, бросается тень на спортивное руководство страны и т. д. Но это все отнюдь не смертельно. И возникает вопрос: если Баричко причастен к укрытию от допинг-контроля, то зачем ему это нужно? Поступок, по меньшей мере, странный и непонятный, который порождает гораздо больше проблем, чем дала бы обычная дисквалификация спортсмена. Огромный вред, нанесенный не только белорусскому олимпийскому движению, но и всему спорту, переоценить сложно. С уверенностью можно сказать одно – этот скандал будет аукаться нашим спортсменам еще долго.

Ситуация осложняется тем, что практически повсеместно существует уверенность в том, что Баричко действовал сознательно. Если все же допустить, что Баричко ничего не знал, то бардак в рядах нашей команды (а за порядок как руководитель отвечает именно он) не становится более понятным.


Здесь же вспоминается и история с нашим прыгуном с трамплина Андреем Лысковцом, не явившимся к самолету, который должен был доставить его на родину. За помощью в поисках пришлось обратиться в полицию, и в оргкомитет игр, и в Госдепартамент США. Кто же должен следить за спортсменами, которые отправились отстаивать честь своей страны? Или вопрос нужно ставить по-другому: зачем отправились наши спортсмены в Солт-Лейк-Сити? ■

АГРАСЭКТАР

ВЯСНА ПА ПРАВІЛАХ

ТАЦЦЯНА ПАПОВА

Нягледзячы на шматлікія абяцаньні ўраду рэфармаваць сельскагаспадарчы комплекс і насуперак прынятай праграме сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця, перамен у сельскай гаспадарцы ў гэтым годзе не чакаецца.



Калгасы й саўгасы захоўваюцца й працягваюць карміцца зь бюджэту. Цудоўныя вынікі працы альтэрнатыўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якімі хваліўся міністар сельскае гаспадаркі М. Русы пры канцы мінулага году, не натхняюць урад на рэформы. Узорныя прадпрыемствы павінны былі будавацца па прынцыпе натуральнае гаспадаркі. Чакалася, што сельгасабʼяднаньні будуць самі вырошчваць, перавозіць, апрацоўваць, захоўваць сваю прадукцыю. Аднак для інтэграцыі адрозных субʼектаў гаспадараньня, нават дзяржаўных, патрэбны адпаведнае заканадаўства, час і сродкі. Бязь іх асобныя пасьпяховыя прыклады застаюцца выключэньнямі з правіла жабрацкае вёскі.

Старшыня ўраду Генадзь Навіцкі не асабліва прыслухоўваецца да парадаў сваіх падначаленых, бо адзінае слушнае для яго меркаваньне – меркаваньне патрона. Гэты прэм'ер стаўся адным з найбольш удалых бацькавых кадравых прызначэньняў. Яшчэ ніхто настолькі старанна й дакладна не выконваў ягоных загадаў. Пастанова саўміну аб першасных мерах па падрыхтоўцы да веснавое сяўбы выйшла раней, чым падобны дакумэнт пасьпелі сачыніць у прэзыдэнцкай адміністрацыі.

Пастанова саўміну не вызначаецца навацыямі. У адным зь першых абзацаў запісаныя пляны ўраджаяў збожжа (6,4 мільёна тон), бульбы (8,3 мільёна тон) ды іншых сельгаспрадуктаў. Толькі пасьля сталі прыкідваць, якія сродкі варта задзейнічаць, каб сабраць такі багаты ўраджай. Нагадаем, што рэсурсаў стала менш, бо зношанасьць тэхнікі толькі павялічылася, а плошчы палёў паменшыліся. Вызваленьне некаторае колькасьці зямлі абумоўлена тым, што дагэтуль калгасьнікі сеялі, нават калі ўвосень зьбіралі па 5–10 цэнтнэраў з гектару. Такія ўраджаі былі нявартыя ані высілкаў, ані грошай, затрачаных на іх здабыцьцё.

Урад Навіцкага вельмі чула падыйшоў да рэалізацыі лукашэнкавай мары закукурузіць беларускія палі. Таму асобным пунктам у пастанове фігуруюць абʼёмы закупкі кукурузнага насеньня за мяжой. Адылі, зацьверджанае вельмі дакладнае разьмеркаваньне кукурузных палеткаў па вобласьцях. Міністэрству сельскае гаспадаркі й харчаваньня пры неабходнасьці дазваляецца ўносіць прапановы аб вызваленьні ад падатку на дадзены кошт і мытнае пошліны на насеньне, а таксама сродкі абароны ўраджаю, што завозіцца ў Беларусь з замежжа.

Прысутнасьць Навіцкага на прэм'ерстве адчуваецца нават па фармулёўках у пастанове. На *«удешевление стоимости семян»* зь бюджэту вобласьцяў мусіць быць вылучана 6,6 мільярда. Прычым на Берасьцейшчыне на гэта будзе патрачана ўдвая менш сродкаў, чым на Магілёўшчыне, і больш як утрая, чым на Меншчыне. Да лета агульная колькасьць такіх субсыдыяў мусіць дасягнуць 10,5 мільярда *BYR*. Сачыць за паступленьнем грошай павінна вышэйзгаданае міністэрства. Аблвыканкамы, у сваю чаргу, адказныя за авансаваньне авіяцыйнае працы на палетках. Самім калгасам заплаціць за палёты над палямі немагчыма, таму ім дазваляюць выдаткаваць толькі палову ад патрэбнае сумы. Астатнія выдаткі на авіятараў падзеляць між сабою рэспубліканскі й мясцовыя бюджэты.

Нягледзячы на істотнае памяншэньне субсыдыяў сельскагаспадарчым прадпрыемствам, дэклараваных цягам абмеркаваньня бюджэту на 2002 год у Палаце прадстаўнікоў, велізарная частка сабраных падаткаў зноў зарываецца ў зямлю. Па самых сьціплых падліках, толькі ў часе сяўбы калгасы ды саўгасы атрымаюць ад дзяржавы больш як 150 мільёнаў *USD* без уліку ўсіх схаваных прывілеяў, кшталту вызваленьня ад падаткаў. Гэтага ім будзе недастаткова, таму яшчэ 70 мільярдаў *BYR* (амаль трэціну ад згаданае бюджэтнае сумы) калектыўныя гаспадаркі пазычаць у банкаў.

Але перад гэтым гаспадаркі павінны разьлічыцца са сваімі мінулагоднімі крэдытэрамі. Наіўна думаць, што ім загадаюць рабіць гэта ў поўным абʼёме. Толькі за хімічныя сродкі, ужытыя на палёх у мінулым годзе, запазычанасьць, што мусіць быць рэструктуравана, складае 66,5 мільярда *BYR*.

Аб фінансавым аспэкце заахвочваньня дзяржаўных сялян у пастанове прэм'ера няма ані слова. Між тым, менавіта заробак ва ўмовах адсутнасьці прыватнае ўласнасьці на зямлю ёсьць найбольшым стымулам для калгасьнікаў працаваць. Цяперашнія ягоныя памеры не стымулююць, а правакуюць узяць тое, на што грошай не стае. І так будзе да тае пары, пакуль гаспадаркі будуць калектыўнымі. ■

СТОЙ, КТО ИДЕТ?

Военная реформа –1

Окончание. Начало на стр. 1

Сухопутные войска подразделяются на два оперативных объединения: *«Западное командование»* с дислокацией в Гродно и *«Северо-западное командование»* с дислокацией в Борисове. Как видим, армии, корпуса, мотострелковые дивизии и всякие-разные полки останутся лишь в воспоминаниях и военных мемуарах.

Мотострелковые, артиллерийские полки и другие воинские части переформируются в бригады различного батальонного и дивизионного состава. Новые бригады, уже названные *«механизированными»*, комплектуются по-старому из рот и взводов. Механизированные и прочие бригады станут основными тактическими единицами реформированных вооруженных сил Беларуси.

Конкретные сроки проведения заключительного этапа еще не определены. Но в качестве отправной даты следует считать 2003 год, когда намечено вручать новым частям и соединениям некие *«боевые знамена РБ»*.

Новая структура двух командований выстраивается в точности с особым пунктом латыповской концепции *«Безопасность РБ в военной сфере»*. Там заявлено, что чуть ли не основным *«фактором угрозы»* является *«стремление отдельных государств (коалиций государств) решать проблемы международной безопасности применением военной силы и формирование международного общественного мнения, оправдывающего применение военной силы при разрешении противоречий»*. В армейских методических пособиях по военной реформе вышеозначенная угроза трактуется предельно ясно – *«учитывая недавние события в Югославии и Афганистане»*.

Итак, вероятные противники реформируемых вооруженных сил РБ отныне располагаются исключительно за Бугом и Двиной. Польша угрожает нашим военным реформаторам членством в НАТО. Поэтому ими и создается Западное командование. А на случай расширения Северо-атлантического договора – Северо-западное командование для Латвии и Литвы.

Угрозы с юга и юго-запада, новая военная доктрина не предусматривает. Не говоря уже о восточном азимуте, где формируется *«единое оборонное пространство в соответствии с Договором о создании Союзного государства»*.

Более того, уже действует совместная белорусско-российская комиссия по унификации военного законодательства. А два белорусских оперативных направления достаточно органично вписываются в будущую структуру союзного командования.

Нельзя исключать того, что все реформирование белорусских вооруженных сил согласовано с российским генштабом. Есть даже версия, что министр обороны Мальцев является московской креатурой, возвращенной на должность, дескать, вопреки мнению президента Лукашенко.

Гораздо яснее просматриваются бюрократические мотивы военной реформы. До тех пор пока она не будет завершена или скоропостижно свернута (что маловероятно), все реформаторы в Минобороне и президентской администрации останутся на своих постах.

Как бы там ни было, реформирование вооруженных сил Беларуси идет полным ходом. Вскоре на основе существующих воздушно-десантных соединений и частей ожидается появление *«мобильных»* воинских формирований в составе мобильного рода войск со своим командованием.

Командование ПВО и ВВС тоже интегрируется. Хотя в силу организационной сложности этот вид вооруженных сил больше напоминает совмещенный санузел.

Личный состав всех родов войск подлежит сокращению с 83 тысяч солдат и офицеров (по состоянию на декабрь 2001 года) до 52 тысяч (предположительно декабрь 2005 года). Сокращение наличных сил и средств, а также новые принципы комплектования реформированных войск заслуживают отдельного рассмотрения.

(Продолжение в следующем номере)



СЛЕПАЯ ФЕМИДА

БЫЛА БЫ СТАТЬЯ...

АЛЕКСАНДР КАВАЛЬСКИЙ

Если на сцене в начале спектакля висит ружье, будьте спокойны, до конца третьего акта оно обязательно выстрелит. Таковы неумолимые законы театра. Если в уголовном кодексе предусмотрено наказание за оскорбление главы государства, рано или поздно у власти не хватит сил, чтобы противиться искушению применить эти статьи к своим политическим оппонентам. Таковы неумолимые законы жизни.

Статьи 367 и 368 УК РБ, предусматривающие наказание за клевету в адрес президента и оскорбление главы государства, появились всего год с лишним назад, когда с 1 января 2001 года был введен в действие новый Уголовный кодекс. Уже тогда правозащитники указывали, что ни одно цивилизованное государство не содержит подобных статей в своем законодательстве. Во-первых, потому что глава государства на то и публичный политик, а не монарх, чтобы стоически реагировать на всякого рода обвинения. Во-вторых, потому что он имеет полное право как гражданин воспользоваться обыкновенной процедурой защиты в суде своего доброго имени, подав соответствующий иск на обидчика.

Как оказалось, правозащитники беспокоились не зря. Только по результатам президентской кампании по статьям 367 и 368 обвинили восьмерых человек. Над пятерыми «зубрами» судебный процесс уже начался 13 февраля. И что символично – на малой родине президента в Шклове. Еще двоим – главному редактору газеты *«Пагоня»* Николаю Маркевичу и журналисту этого издания Павлу Мажейко – обвинения только предъявлены и взята подписка о невыезде соответственно 13 и 14 февраля. Кучно бьют, ничего не скажешь.

Первыми обвинили членов незарегистрированного молодежного движения «Зубр». 14 августа Михаил Киселев, Максим Потапчик, Александр Павлович, Денис Сенокосов и Дмитрий Шалашков одели усатые маски и посетили шкловские магазины, где провели *«предвыборную агитацию»* среди покупателей: обещали им зарплату в 100 *USD*, снижение цен, клялись пересажать всех жуликов, предпринимателей и всех, кто не будет голосовать за земляка. Перфоманс был прекращен сотрудниками милиции, которые в усатых масках опознали кандидата в президенты Александра Лукашенко. Примечательно, что сразу протоколы были составлены по ст. 156 КоАП (мелкое хулиганство), а несовершеннолетних участников акции отпустили. Но уже 16 августа было возбуждено уголовное дело по ст. 368 ч. 1 УК РБ (публичное оскорбление президента Республики Беларусь). А поскольку уголовная ответственность у нас наступает с 14 лет, то под статью попали все – совершеннолетние и не только – дети.

5 сентября в Речице было заведено уголовное дело по ст. 367 (клевета в отношении президента Республики Беларусь). По этому делу была задержана активистка Объединенной гражданской партии Наталья Брель. 27-летняя аспирантка Института истории НАН три дня находилась в изоляторе временного содержания и отказывалась от дачи показаний. Только 8 сентября ее освободили под подписку о невыезде. Причина – коробка с подарками президенту ко дню рождения, которую активисты ОГП и Молодого фронта передали А. Лукашенко 30 августа через местного вертикальщика. Распаковав коробку, любопытный чиновник увидел там среди прочего и веревку, завязанную узлом. Поэтому подарок отправился не к имениннику, а к районному прокурору.

Наконец, 13 и 14 февраля обвинения по ст. 367 ч. 2 УК были предъявлены главному редактору и журналисту *«Пагоні»* – Николаю Маркевичу и Павлу Мажейко. Причиной послужили три публикации в 36-м номере газеты за прошлый год, который должен был выйти в свет 4 сентября. Бдительные правоохранительные органы конфисковали тогда весь тираж издания еще в типографии. Предвыборный спецвыпуск уже привел к тому, что в рамках гражданского законодательства Высший хозяйственный суд закрыл *«Пагоню»*. Теперь фактически на тех же эпизодах раскручивается уголовное дело.

Как видим, каждого из восьмерых обвиняют по разному поводу, но всех объединяет то, что наказание по злополучным статьям об оскорблении и клевете предусмотрено нешуточное. Лакмусовой бумажкой должен стать уже начавшийся процесс над «зубрами». Поскольку обвиняемые отказались давать показания, суд перешел к допросу свидетелей. В результате, пока ни один свидетель не поддержал линию обвинения, ни один из них не узрел в действиях ребят оскорбления А. Лукашенко. 26 февраля суд продолжится.

Между тем, Николай Маркевич на непредвзятость суда особенно не рассчитывает. Судьи – не только просто люди, их еще назначает и снимает с должности сам президент. В данном случае – обиженный. *«Нас с Павлом может спасти только волна народного возмущения»*, – считает редактор закрытой *«Пагоні»*.

Есть во всей этой истории и еще один аспект. Глава Национального олимпийского комитета (по совместительству президент страны) публично демонстрирует образец неспортивного поведения. На него в суд за оскорбление и клевету подать нельзя (многие уже пытались – ничего из этого не получилось). А вот для остальных красная карточка в виде статей 367 и 368 используется при малейшем намеке на нарушение. И после этого мы еще удивляемся неудачам нашей сборной на Олимпиаде. ■

НОВОСТИ СНГ



Украина. Предвыборная кампания на Украине в разгаре. Парламентские выборы, как известно, состоятся 31 марта. Готовясь стать депутатами, некоторые украинские политики вовсю раскручивают свои имена в качестве торговых марок. Государственный департамент интеллектуальной собственности Украины выдал патенты на брэнды «Блок Ющенко» и «Виктор Ющенко». Патенты получены Молодежной партией Украины – одной из основательниц блока Ющенко – «Нашей Украины», заявил лидер партии Юрий Павленко. Павленко подчеркнул, что это является первым случаем патентования имени политика в Украине. Украинскому избирателю остается лишь правильно выбрать свой брэнд. Обычно с пивом таких проблем не возникает.

Азербайджан. Похоже, слухи о серьезных проблемах со здоровьем президента Гейдара Алиева подтвердились. В клинике американского города Кливленд ему была сделана операция на предстательной железе. После реабилитационного периода президент намерен вернуться к исполнению своих обязанностей. Информация о состоянии здоровья президента относится к разряду табу среди правящей элиты. Считается, что весть об ухудшении здоровья Алиева может спровоцировать дестабилизацию политической обстановки в стране. Но, несмотря на все усилия властей, внутриполитическая ситуация в Азербайджане постепенно начинает обостряться. Разумеется, в соответствии с этическими нормами оппозиционеры заявляют, что *«желают Гейдару Алиеву, так же как и любому другому гражданину Азербайджана, здоровья»*, но при этом они не хотят видеть его во главе страны. Заметную активность продемонстрировали лидеры ведущих политических партий Азербайджана в лице «Мусавата», Гражданского единства, Либеральной и Демократической партий. Они приняли решение не позднее второй половины марта начать массовые акции протеста с требованием отставки нынешнего политического руководства республики.

Туркменистан. 19 февраля в Туркменистане отмечался двойной праздник – День государственного флага и день рождения президента. По столь торжественному поводу в республике устроили военный парад, праздничные манифестации, народные гуляния и концерт мастеров искусств. К своим 62 годам Сапармурат Ниязов успел наработать 17-летний стаж руководителя республики, а с декабря 1999 года постановлением Народного Совета ему утвержден пожизненный срок. На малой родине туркменбаши в ауле Кипчак состоялся торжественный обед в честь дня рождения туркменского вождя, в котором приняло участие более 15 тысяч человек. Достижение возраста пророка Мухаммеда (62 года) сопровождалось проведением обряда «ак гоюнын тойы» – жертвоприношения белого барана. Не оплошал с подарком и туркменский меджлис (парламент), наградивший президента премией классика литературы Махтумкули и орденом «Рухыбилент» (Высокий дух) за создание священной книги туркмен – «Рухнаме». Кстати, данная книга обязательна для изучения во всех учебных заведениях Туркменистана. Не преминул поздравить именинника президент Путин, свои скромные подарки преподнесла и российская пресса – «Независимая газета» опубликовала опус об успехах Туркменистана под мудрым руководством туркменбаши.

Таджикистан. Борьба с бедностью – не такое уж простое дело. В этом лишний раз пришлось убедиться таджикским властям. Злая судьба в лице МВФ требует от Таджикистана вернуть предоставленные кредиты на сумму 31,6 миллиона долларов, так как при выделении денег фонд был введен в заблуждение. Причина: фонд не был проинформирован о том, что платежи по двум гарантированным правительством частным кредитам просрочены, что считается серьезным нарушением у финансовых бюрократов. В итоге, начиная с июня этого года, Таджикистану предложено возвращать указанную сумму не сразу, а по частям. Впрочем на упреки со стороны МВФ Таджикистан всегда сможет сослаться на ту же самую бедность. Хотя мир все-таки не без добрых людей: Япония выразила готовность выделить Душанбе *«на борьбу с бедностью»* 8 миллионов долларов.

